основывалось на коллективном классовом сознании и революционном действии. Либерально-демократическое придерживалось постепенного, эволюционного разрешения национальных и социальных проблем.

[1] См.: Jrkiewicz J. Rozwój polskiej mysli politycznej na Litwe i Białorysi w latach 1905–1922. Poznań, 1986. S.15–16.
[2] НАРБ (Гродно). Ф.1., оп.8, д.2109, лл.1–3.
[3] См.: Самбук С. Политика царизма в Беларуси во второй половине XIX в. Мн., 1980, С.33.
[4] НАРБ (Минск). Ф.60, оп.3, д.3, л.15.
[5] См.: Korwin-Milewski H. Sedemdziesiant lat wspomnień (1855–1925). Poznań,1930. S.41.
[6] Kurier Litewski (KL). 1905. №65.
[7] KL. 1907. №135.
[8] Gazeta Wileńska. 1906. №1.
[9] См.: Формы национального движения в современных государствах: Австро-Венгрия, Россия, Германия. Спб.,1910. С.68.
[10] KL.1907. №247.
[11] KL.1906. №12.
[12] Program Stronnictwa Konstytucyjno-Katolickego na Litwe i Białorusi. Wilno,1906.
[13] Polskie Stronnictwo Demokratyczno-Narodowe na Litwe. Wilno,1906.
[14] Ibid.
[15] Ibid. S.56.
[16] НАРБ (Минск). Ф.60, оп,2, д.54, л.16.
[17] Przeglend Wszechpolski.1903. №10.
[18] Materialy do historii PPS i ruchu rewolucyjnego w zaborze rosyjskim. Od.r. 1893–1904. Warszawa,1907. T.1. S.31.
[19] Materialy do dziejów ruchu s-d w Polsce. Socyaldemokracya Królewstwa Polskiego i Litwy. Warszawa, 1962. Cz.1. (1893–1903). S.74
[20] См.: Очерки революционных связей России и Польши. 1815–1917. М., 1976. С.236.

*М.Б.ШЧАЎЛІНСКІ*

## БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ РУХ НА АКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ КРАЮ З ВОСЕНІ 1915 г. ДА ЛЮТАЎСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ 1917 г.

У гістарычнай навуцы з-за адсутнасці фактычнага матэрыялу і існавання пэўных стэрыятыпаў і догмаў (класавы падыход, партыйнасць і г. д.) перыяд развіцця Беларусі з 1914 па люты 1917 г. вывучаны павярхоўна і аднабакова. Пры разглядзе гэтай праблематыкі многія даследчыкі асноўную ўвагу надавалі падзеям на фронце, рабочаму і сялянскаму руху. А беларускае нацыянальнае адраджэнне, асабліва на акупіраванай тэрыторыі краю, разглядалася як рэакцыйная з'ява і таму практычна не асвятлялася ў гісторыяграфіі. Сёння, калі адкрыты шырокі доступ да архіўных дакументаў і на старонках газет і часопісаў друкуюцца цікавыя артыкулы і матэрыялы, наспела неабходнасць дэталёвага вывучэння і глыбокага пераасэнсавання ўсяго, што непасрэдна звязана з дзейнасцю беларускіх нацыянальных арганізацый і груп пад час нямецкай акупацыі з восені 1915 г. да Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

Заходняя частка Беларусі (Гродзенская, большая частка Віленскай і частка Мінскай губерняў) была акупіравана германскімі войскамі восенню 1915 г. Захопленая праціўнікам тэрыторыя складала прыкладна чацвёртую частку Беларусі, дзе да вайны пражывала каля двух мільёнаў чалавек.

Невялікая група беларускіх дзеячаў, што засталася ў акупіраванай Вільні, працягвала нацыянальную работу ў новых умовах. Створаная ў красавіку 1915 г. дабрачынная арганізацыя "Беларускае таварыства дапамогі ахвярам вайны" пасля эвакуацыі з Вільні яе старшыні Вацлава Іваноўскага працягвала сваю дзейнасць пад кіраўніцтвам Антона Луцкевіча.

З дакументальных крыніц гэтага таварыства вынікае, што яно аб'ядноўвала ўсе палітычныя групы беларусаў, каталікаў і праваслаўных і стала агульнанацыянальнай арганізацыяй"[1]. У склад таварыства ўваходзілі такія вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху, як Ф.Аляхновіч, А.Пашкевіч (Цётка), В.Ластоўскі, браты Іван і Антон Луцкевічы, У.Святаполк-Мірскі, У.Талочка і інш.

Асноўны змест работы арганізацыі складала стварэнне пунктаў харчавання, адкрыццё сталовых, інтэрнатаў, дзіцячых дамоў і аказанне медыцынскай

дапамогі бежанцам. Акрамя аказання маральнай і матэрыяльнай дапамогі ахвярам вайны, таварыства выконвала абавязкі прадстаўніка нацыянальных інтарэсаў беларускага насельніцтва перад акупацыйнымі ўладамі, актыўна праводзіла культурна-грамадскую работу, выкрывала палітыку некаторых польскіх арганізацый і духавенства, накіраваную на апалячванне беларусаў-католікаў, выступала за рэарганізацыю касцёла і інш. Напрыклад, у адным з дакументаў, накіраваных кіраўніцтвам гэтага таварыства да нямецкіх акупацыйных улад, выказвалася патрабаванне: "...рэарганізаваць у краі вышэйшае кіраўніцтва каталіцка-клерыкальных касцёлаў шляхам увядзення ў яго прадстаўнікоў не толькі палякаў, але і беларусаў і літоўцаў для таго, каб беларускі народ атрымаў магчымасць слухаць божае слова на сваёй роднай мове і каб клір перастаў служыць крыніцай польскай прапаганды"[2].

Акрамя "Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны" нацыянальную работу сярод беларускага насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі праводзіла створаная восенню 1915 г. братамі Луцкевічамі Беларуская сацыял-дэмакратычная рабочая група (БСДРГ). У склад арганізацыі разам з Луцкевічамі ўваходзілі Я.Ліцкевіч, Я.Туркевіч, Я.Салавей і інш. Робячы асноўную стаўку на прапагандысцкую работу ў масах, БСДРГ найбольшую ўвагу надавала прафсаюзам, кааператыўным таварыствам і іншым рабочым арганізацыям, у якіх мела сваіх прадстаўнікоў.

З 1915 г. у заходняй частцы Беларусі пачала дзейнічаць рэлігійна-клерыкальная арганізацыя "Хрысціянская злучнасць" (ХЗ). Яе арганізатарамі былі барон Ропп, князь Святаполк-Мірскі, барон Шафнагель, ксёндз Б.Гадлеўскі, А.С.Астравовіч і інш. Сацыяльны склад "Хрысціянскай злучнасці" ахопліваў прадстаўнікоў вышэйшых колаў духавенства, буйной буржуазіі, памешчыкаў, а таксама частку сялян, рабочых, што і дазваляла яе лідэрам сцвярджаць, быццам ХЗ з'яўляецца народнай партыяй. Арганізацыя адстойвала ідэю самастойнасці беларускага народа на ўсіх яго землях, аб'яднанага ў незалежную дэмакратычную дзяржаву, і не падпарадкоўвалася ў палітычных пытаннях царкоўнай іерархіі[3].

У эканамічным пытанні "Хрысціянская злучнасць" падтрымлівала беларускіх прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў у іх канкурэнтнай барацьбе з польскімі і яўрэйскімі сапернікамі, якія ў час вайны займалі дамінуючае становішча ў беларускай эканоміцы.

У аграрным пытанні прадстаўнікі ХЗ выступалі за захаванне памешчыцкага землеўладання, пратэставалі супраць захопу сялянамі прыватнаўласніцкіх зямель, патрабавалі канстытуцыйнага вырашэння аграрнага пытання. Пазней гэтыя ідэі ляглі ў аснову дзейнасці "Хрысціянскай дэмакратычнай злучнасці" і "Беларускай хрысціянскай дэмакратыі"[4].

Восенню 1915 г. на акупіраванай тэрыторыі Беларусі з мэтай кансалідацыі нацыянальных сіл быў створаны Беларускі Народны камітэт (БНК). Яго дзеячы сумесна з прадстаўнікамі польскіх, літоўскіх і яўрэйскіх арганізацый абвясцілі сваёй мэтай – адраджэнне на землях Літвы і Беларусі незалежнага Вялікага княства Літоўскага[5].

Пасля таго, як канцлер Германіі Бетман-Гольвег заявіў, што вызваленыя ад Расіі землі не вернуцца назад пад маскоўскае ярмо, па ініцыятыве БНК у канцы 1915 г. была заснавана "Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага", у якую ўвайшлі прадстаўнікі беларускіх, літоўскіх, польскіх і яўрэйскіх арганізацый. 19 снежня 1915 г. Часовая рада Канфедэрацыі апублікавала "Універсал", у якім была вылучана ідэя стварэння "на літоўскіх і беларускіх землях незалежнай Літвы і Беларусі, як адзінай дзяржавы, якая захоўвае ўсім нацыям ў яе межах усе правы"[7]. У дадатак да "Універсала" ў лютым 1916 г. была распрацавана "лістоўка-заклік", у якой больш падрабязна выкладаліся асноўныя пачаткі палітычнага ладу будучай Канфедэрацыі. У адпаведнасці з гэтым дакументам на землях Літвы і Беларусі меркавалася стварыць незалежную дзяржаву з соймам у Вільні, абраным на аснове агульных роўных і прамых выбараў пры тайным галасаванні. У пункце другім гэтага закліку гаварылася, што "Канфедэрацыя імкнецца да таго, каб

у склад новай літоўска-беларускай дзяржавы ўвайшлі па крайняй меры землі, занятыя нямецкімі войскамі"[8].

Аднак "адраджэння гістарычнай Літвы" не адбылося. Па-першае, з самага пачатку на галоўную ролю ў Канфедэрацыі прэтэндавалі літоўцы. Так, на Радзе літоўцаў і латышоў, што адбылася ў Коўне 6 студзеня 1916 г., быў створаны "Галоўны Літоўскі камітэт", які аб'явіў незалежнасць зямель былога Вялікага княства Літоўскага. У трэцім пункце акта абвяшчэння незалежнасці зямель былога Вялікага княства Літоўскага гаварылася, што "беларусы маглі далучыцца (да Канфедэрацыі – аўт.) як трэцяя аўтаномная састаўная частка"[9]. Відаць, што літоўцы клапаціліся хутчэй за ўсё аб стварэнні сваёй самастойнай дзяржавы, баючыся, што ў сумеснай дзяржаве яны могуць быць асіміляваны беларускай большасцю. Згодна з падлікамі Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны, тады пад уладай Германіі знаходзілася каля 1 млн 500 тыс. беларусаў[10].

Па-другое, у "адраджэнні гістарычнай Літвы" не была зацікаўлена кайзераўская Германія, якая сама была не супраць узмацніць сваю ўладу на захопленай тэрыторыі. Таму германскае камандаванне абвясціла літоўска-беларускія землі прыналежнымі "польскай кароне"[11]. З мэтай апалячвання беларусаў на тэрыторыі заходняй часткі Беларусі была створана сетка польскіх камітэтаў, польскіх школ для беларусаў, касцёлаў і розных гурткоў польскай "злучнасці". "Цэнтральны саюз беларускіх нацыянальных арганізацый" (створаны ў пачатку 1916 г.) у адным са сваіх лістоў, адрасаваных у Берлін "Саюзу вызвалення Украіны", паведамляў: "Польская грамадскасць, можна сказаць, аб'явіла нам, беларусам, непрымірымую вайну"[12].

Аднак на шляху паланізацыі Беларусі стаяла "зямельнае пытанне". Беларускае сялянства складала не толькі большасць насельніцтва, але і адзіную яго частку, за якой стаяла доўгая традыцыя. Яго сацыяльная і эканамічная варожасць – пастаянная аснова сялянскага нацыяналізму – была накіравана супраць памешчыкаў (галоўным чынам польскіх, якіх у Беларусі была большасць). Праваслаўная рэлігія (на долю католікаў прыходзілася ўсяго толькі 18% насельніцтва) звязвала сялян з рускай царквой, таму польскі каталіцызм быў для іх чужым. Натуральна, што супярэчнасці паміж сялянствам Беларусі і польскімі памешчыкамі былі асноўнай прычынай, з-за якой распалася Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага.

Пасля распаду Канфедэрацыі германскія ўлады прымянілі новую тактыку ў адносінах да насельніцтва акупіраванай часткі Беларусі. 7 чэрвеня 1916 г. фельдмаршал Гіндэнбург выдаў загад аб кіраванні землямі "Обэр–Ост". У артыкулах загаду гаварылася, што ўсе народы ў акупіраваным краі валодаюць аднолькавымі правамі. Асобы, якія парушалі гэтыя артыкулы, штрафаваліся да 10 000 марак або падвяргаліся турэмнаму зняволенню тэрмінам да пяці гадоў[13]. Згодна з тымі ж артыкуламі загаду, беларуская мова абвяшчалася раўнапраўнай з польскай, літоўскай і яўрэйскай і мела права ўжывання ў грамадзянскім, культурным, адміністрацыйным жыцці[14].

Пасля гэтага беларускі нацыянальны рух значна актывізаваўся. З сярэдзіны 1916 г. на беларускай мове сталі друкавацца пашпарты, заклікі, брашуры. Пры штабе галоўнакамандуючага ў Коўне знаходзіўся перакладчык-беларус, які перакладаў з нямецкай мовы на беларускую ўсе загады і распараджэнні, што тычыліся беларускай нацыі. У Вільні, Гародні, Лідзе і іншых гарадах пачалі адкрывацца беларускія пачатковыя школы. Многія з іх, як у Свянцянскім уездзе, дзе было адкрыта чатыры школы, утрымліваліся за кошт сялян[15]. Аднак развіццё беларускіх школ сутыкалася з дзвюма праблемамі – недахопам выкладчыкаў і адсутнасцю беларускіх школьных падручнікаў. Некаторыя з настаўнікаў у пачатку вайны былі мабілізаваны ў царскія войскі, другія лічылі беларускую мову "мужыцкай" і "халопскай", трэцім патрабавалася перападрыхтоўка ў беларусазнаўстве. У сувязі з гэтым І.Луцкевіч і А.Пашкевіч (Цётка) яшчэ ў лістападзе 1915 г. у Вільні адкрылі гадавыя настаўніцкія курсы, а ў кастрычніку 1916 г. – шасцімесячныя. Затым у кастрычніку 1916 г. руская "Настаўніцкая семінарыя" ў м. Свіслач Ваўкавыскага уезда была рэарганізавана ў беларускую. У семінарыі выкладчыкамі

працавалі: Пачопка, Квіцінскі, Вернікоўскі, часова прафесар Рудольф Абіхт з Вроцлаўскага універсітэта. Акрамя таго, у семінарыі вялі заняткі вядомыя беларускія дзеячы, напрыклад: А.Луцкевіч выкладаў беларускую граматыку, І.Луцкевіч – геаграфію, В.Ластоўскі – гісторыю, Цётка – педагогіку, С.І.Іваноўская – гімнастыку.

Разам са школьнай справай на акупіраванай тэрыторыі Беларусі развіваліся прэса і кнігадрукаванне. Выпускам школьных падручнікаў займалася заснаванае ў канцы 1916 г. выдавецтва Беларускага народнага камітэта. З 15 снежня 1916 г. пад рэдакцыяй В.Ластоўскага ў Вільні двойчы ў тыдзень пачала выходзіць беларуская газета "Гоман". На яе старонках змяшчаліся распараджэнні акупацыйных улад, вялася барацьба з польскім засіллем, шмат месца адводзілася для літаратурных сачыненняў і гісторыка-публіцыстычных матэрыялаў. У газеце друкаваліся сачыненні Ф.Багушэвіча, Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, Цёткі, М.Гарэцкага, Зм.Бядулі, Ц.Гартнага, Я.Баршчэўскага. "Гоман" актыўна выступаў за стварэнне незалежнай Беларускай рэспублікі або федэратыўнага "Беларуска-Літоўскага краю". "Дзяржава як форма існавання народа, – пісала газета, – можа быць знішчана, разбіта, аднак яна ў рэшце рэшт адбудуецца па-новаму: калі сам народ захаваў у сабе іскру жыцця, творчую сілу"[16].

Значнай падзеяй у культурным жыцці Вільні з'явілася адкрыццё тут 1 чэрвеня 1916 г. Беларускага клуба, у рамках якога быў арганізаваны тэатр. Яго стварэнне звязана з імем Ф.Аляхновіча, які аб'яднаў у сабе талент драматурга, рэжысёра і акцёра. Сярод удзельнікаў тэатра былі: П.Бароўскі, Ф.Жукоўскі, М.Булгак, С.Кашынская[17]. У тэатры ішлі п'есы самога Ф.Аляхновіча "На Антокалі", "Бутрым Няміра", а таксама "Паўлінка" Я.Купалы, "Хам" Э.Ажэшкі.

Акрамя тэатра ў Вільні ў гэты час былі створаны такія беларускія грамадскія арганізацыі, як дзіцячы прытулак "Золак", кааператыўнае таварыства "Раніца", "Навуковае таварыства", "Цэнтральны саюз грамадскіх арганізацый" на чале з Беларускім народным камітэтам (БНК).

Важным крокам на шляху станаўлення нацыянальнай самасвядомасці беларусаў неабходна лічыць заявы і выступленні прадстаўнікоў БНК на міжнародных кангрэсах. Так, у красавіку 1916 г. БНК прадстаўляў усю Беларусь на канферэнцыі народаў Расіі ў Стакгольме. Прадстаўнікі БНК В.Ластоўскі і Я.Салавей сумесна з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей Расійскай імперыі падпісалі тэлеграму на імя прэзідэнта Паўночна-Амерыканскіх Штатаў В.Вільсана[18]. У гэтай тэлеграме быў змешчаны зварот да прэзідэнта, а таксама да саюзнікаў Расіі ў вайне з просьбай аблегчыць "невыносныя пакуты" расійскіх нацыянальных меншасцей[19]. Акрамя таго, дэлегацыя БНК на гэтай канферэнцыі выклала палітычную дэкларацыю, у якой было заяўлена, што "беларускі народ жадае вызваліцца з-пад расійскай няволі"[20]. Аб важнасці рашэнняў гэтага міжнароднага форума гаворыць той факт, што дэпартамент паліцыі асобага аддзела Расійскай імперыі ўважліва сачыў за работай канферэнцыі і пасля яе заканчэння выдаў сакрэтны цыркуляр, у якім патрабаваў "устанавіць надзор за прыбыццём дэлегатаў у межы імперыі, і ў выпадку іх з'яўлення, падвергнуць усіх...вобыску і арышту"[21].

Праз месяц беларуская дэлегацыя на чале з В.Ластоўскім зноў удзельнічала ў 3-й канферэнцыі народаў у Лазане (чэрвень 1916 г.). У мемарандуме, прадстаўленым беларускімі дэлегатамі на канферэнцыі, было заяўлена, што беларусы "просяць у цывілізаваных народаў спачування і падтрымкі" для таго, каб "стаць гаспадарамі на ўласнай зямлі"[22].

Аднак падобная заява была асуджана на гібель, таму што ўрадам краін Антанты была патрэбна Расійская імперыя, якая працягвала б далей вайну з Германіяй і яе саюзнікамі. Да таго ж яны поўнасцю падтрымлівалі імкненні рускай буржуазіі.

Не знайшоўшы падтрымкі і спачування ў цывілізаваных народаў Еўропы, беларускія дзеячы сталі наладжваць новыя перагаворы з Літоўскім камітэтам з мэтай "высветліць асновы сумеснага дзяржаўнага жыцця Літвы і Беларусі"[23]. Аднак літоўцы ў пачатку 1917 г. адмовіліся ад далейшых перагавораў і па

рэкамендацыі Германіі канчаткова парвалі сувязі не толькі з беларусамі, але і з астатнімі нацыямі краю і ўтварылі ў Вільні Літоўскую Дзяржаўную Раду (Тарыбу) як вярхоўны орган Літвы, у склад якой былі ўключаны і беларускія землі, што знаходзіліся пад акупацыяй[24].

Такога павароту падзей ніхто з беларускіх дзеячаў не чакаў. Таму 25–27 снежня 1917 г. у Вільні была склікана канферэнцыя з удзелам прадстаўнікоў усіх грамадска-палітычных арганізацый, якія знаходзіліся пад нямецкай акупацыяй. Вядома, што гэтая канферэнцыя праходзіла пад лозунгам "Мы хочам быць незалежнымі ў сваіх этнаграфічных межах!" У час яе работы ў процівагу літоўскай Тарыбе была створана Віленская беларуская рада на чале з Антонам Луцкевічам[25].

Такім чынам, тыя беларускія дзеячы, якія засталіся на захопленай праціўнікам тэрыторыі, вымушаны былі праводзіць нацыянальную работу ва ўмовах акупацыі. Іх намаганнямі восенню 1915 г. быў створаны БНК, які аб'яднаў усе беларускія арганізацыі і групы ідэяй утварэння нацыянальнай дзяржаўнасці. Аднак з-за палітычных інтрыг Берліна і ва ўмовах вайны гэтая ідэя засталася нязрэйсненай.

Важным дасягненнем у павышэнні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў з'яўляецца выхад беларускіх дзеячаў на міжнародную арэну, дзе яны прынялі ўдзел у міжнародных кангрэсах, якія адбыліся ў Стакгольме і Лазане.

Шмат увагі беларускія арганізацыі і групы надавалі культурна-нацыянальнай рабоце на акупіраванай тэрыторыі і дасягнулі ў гэтым пэўных поспехаў. Аднак ні ў якім разе нельга пераацэньваць падтрымку акупацыйных улад, таму што ўсе гэтыя поспехі былі створаны самімі беларусамі. Усе паслядоўныя і рашучыя крокі, зробленыя беларускімі дзеячамі для вырашэння шматлікіх пытанняў, звязаных з нацыянальнымі інтарэсамі беларусаў, што знаходзіліся пад нямецкай акупацыяй, а таксама ў справе адраджэння нацыянальнай дзяржаўнасці, заслугоўваюць увагі і павагі.

1 Беларускі Дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛМ). Ф.3, воп.1, спр.131, арк.11.
2 Там жа.
3 Сташкевич Н.С. Приговор революции. Мн., 1985. С.41.
4 НАРБ. Ф.62, воп.1, спр.193, арк.132.
5 БДАМЛМ. Ф.3, воп.1, спр.139, арк.19.
6 Турук Ф. Белорусское движение. М., 1921. С.26.
7 Станкевич А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня. Вільня, 1934. С.83.
8 Гл.: Наша ніва. Вільня, 1920. С.78.
9 Станкевіч А. Указ.раб. С.83.
10 БДАМЛМ. Ф.3, воп.1, спр.131, арк.1.
11 Турук Ф. Белорусское движение. С.26.
12 БДАМЛМ. Ф.3, воп.1, спр.29, арк.256.
13 Гоман. 1916. №41.
14 Калубовіч А. Крокі гісторыі. Беласток; Вільня; Менск, 1993. С.40.
15 Там жа. С.46.
16 Гоман. 1916. 14 ліст.
17 Калубовіч А. Крокі гісторыі. С.61.
18 НАРБ. Ф.2499, воп.11, спр.299, арк.5.
19 Там жа.
20 Наша ніва. С.89.
21 НАРБ. Ф.2499, воп.1, спр.299, арк.5.
22 Наша ніва. С.89.
23 Игнатенко И.И. Февральская буржуазно-демократическая революция в Беларуси. Мн., 1986. С.41.
24 Турук Ф. Белорусское движение. С.28.
25 Вяртання маўклівая споведзь: Постаці творцаў беларускай гісторыі ў кантэксце часу. Мн., 1994. С.104.

*В.В.ОДЕРИХА*

## ПАТРОНАЖНО-КЛИЕНТУРНЫЕ ОТНОШЕНИЯ В ГОРОДАХ ЛИВАНА (история и современность)

Процесс капиталистической модернизации породил во многих странах Азии и Африки особый тип переходного общества, который сочетает в себе черты как традиционных патриархальных, так и современных буржуазных отношений. Несмотря на прогресс модернизации и вестернизации, патриархальность продол-